**Вострыкава А. У. (Мінск)**

# ПЕСІМІСТЫЧНЫЯ МАТЫВЫ Ў ПАЭЗІІ ВІЛЕМА ЗАВАДЫ

Вілем Завада (1905-1982) нарадзіўся ў Астраўскім краі. Яго бацька, рабочы-металіст, загінуў у гады Першай сусветнай вайны. Паўгалоднае ваеннае дзяцінства, поўныя нягод гады вучобы ў гімназіі і на філасофскім факультэце Карлава ўніверсітэта – вось такі быў шлях Завады да першага зборніка, які ўжо сваёй назвай “Паніхіда” (1927) супрацьстаяў паэтысцкаму культу радасці і вяселля. Песімістычныя матывы ўласцівы ўсёй творчасці названага чэшскага паэта, аднак найбольш выразна яны ўвасобіліся ў першых трох зборніках: “Паніхіда”, “Сірэна”, “Дарога пешшу”. Менавіта яны і будуць у цэнтры ўвагі нашага даследавання.

Завада-паэт фарміраваўся ў гады панавання паэтызму. Уплыў яго паэтыкі відавочны на “Паніхіду” у прыхільнасці да метафар, у аслабленні лагічных сувязей паміж вобразамі, у вольных асацыяцыях. Сам жа характар вобразаў, тэматыка, агульная танальнасць зборніка былі іншымі. Пазней Завада зазначаў, што паэтызм, з аднаго боку, асляпляў і вабіў яго, а з другога, -- быў яму чыжы. Завада нарадзіўся ў Астраўскім краі, які быў зямлёй шахцёраў, і жыццярадаснае светаадчуванне, якое прапагандавалі паэтысты, ня мог з імі падзяляць. Як і паэтысты, Завада высока цаніў французкую паэзію – Ш. Бадлера, Г. Апалінэра, але яго не ўражвалі эксцэнтрычнасць дадаізма і сюррэалістычныя зонды ў падсвядомае. Ужо ў першым зборніку ён паказаў сябе паэтам, для якога важнае значэнне мае думка, духоўнасць. У яго вершах ажылі некаторыя традыцыі чэшскага сімвалізма, традыцыі О. Бржэзіны і А. Совы – зварот да “вечных” пытанняў пра жыццё і смерць, пра сэнс пакут.

Свет Завада ўспрымаў напоўненым бедамі і горам, ад якіх нельга нікуды схавацца. Гэта ўспрыняцце найбольш выразна перадаецца ў паэме “Паніхіда”, якая дала назву ўсяму зборніку. Паэма ўяўляе сабой мастацкі сінтэз і выражае светапогляд аўтара ў першы перыяд творчасці. На думку даследчыкаў, гэта адзін з вяршынных твораў Завады. Паэма мае падзагаловак ”Паэма меланхоліі”. Прысвячаецца яна В. Нэзвалу, у ёй прасочваюцца паралелі і адначасова спрэчка з паэмай “Дзіўны чараўнік” В. Нэзвала. У якасці эпіграфа да паэмы Завада выбраў словы Дантона *“Праўду! Горкую праўду!”* і двухрадкоўе Г. Апалінэра *“І ты п’еш спірт пякучы як жыцця боль / Твайго жыцця якое ты п’еш як алкаголь”*. Паэма пабудавана ў форме вольнага мантажа вобразаў і асацыяцый, якія спалучаюцца ўмоўным сюжэтам. Сюжэт жа ў тым, што лірычны герой беспаспяхова імкнецца вызваліцца ад моцнага ўнутранага

болю. Настрой паэта перадаецца ў карціне, якая адкрывае паэму: з вокнаў усіх дамоў горада ў памяць пра загінуўшых на вайне замест жалобных сцягаў вырываюцца паветраныя шары. Паэта пераследуе цяжкае пачуццё, народжанае гэтай грандыёзнай паніхідай. У паэме ёсць і матыў вечных метамарфоз, як ў "Дзіўным чараўніку" В. Нэзвала. Аднак Завада згадвае яго дзеля таго, каб аспрэчыць. Лірычны герой паэмы Завады хацеў бы быць смелым і паспяховым, як дзіўны чараўнік, але ён зусім інакш бачыць свет. Паэт не можа не адчуваць тужлівую дробязнасць жыцця. Погляд на свет, блізкі паэтысцкай праграме, увасабляе ў паэме каханая паэта. Завада ўключае ў паэму оду жаночым вачам. Але віхура прыгажосці і асалоды толькі на імгненне адцягвае ўвагу паэта. Не вабіць яго цудоўная прыгожая Францыя, куды кліча яго каханая. Ён марыць пра іншы ўтульны і ўсмешлівы край. Але такога краю не існуе ўвогуле. Вось такое адчуванне неўладкаванасці свету – асноўнае ў лірыцы Вілема Завады. Яно рэзка аддзяляе яго творчасць ад паэтызму і дае аснаванне для супастаўлення з іншай маладой чэшскай паэзіяй 1920-х гг. Аднак і ў параўнанні з пралетарскімі паэтамі ў Завады адсутнічае рэвалюцыйны задор. Рэвалюцыя з'яўляецца ў яго вершах толькі як саркастычны вобраз *"тысячагаловай медузы натоўпу"*, якую узнімае і накіроўвае прамова беспрынцыпнага аратара. Супрацьпастаўленне сучаснаму свету Завада гатовы шукаць хутчэй у народным рэлігійным пачуцці, якое ён аддзяляе ад афіцыйнай царквы, а таксама ў кульце самаахвяравання людзям, якое ён апявае ў розных вобразах святых пакутнікаў. У вершах чэшскага творцы акрэслена яскрава яго этычная пазіцыя: непрыняцце эгацэнтрызму, бесклапотнасці, безадказнасці. Лірыцы ўласцівы высокі маральны пафас.

У паэзіі Вілема Завады прысутнічае і сацыяльнае адчуванне рэчаіснасці. У першым зборніку "Паніхіда" яно складае лірычны падтэкст і абнаружвае сябе ў асобым характары пейзажаў і параўнанняў. У сэрцы паэта жыве вобраз беднага, але бясконца дарагога роднага краю. Разважаючы над прызначэннем паэзіі, Завада супрацьпастаўляе паэтысцкаму вобразу паэта-дзіўнага чараўніка, спрытнага акрабата, вясёлага клоўна – вобраз мудрага і сумнага шута. Дарэчы, зборнік "Паніхіда" сустрэў практычна аднадушнае прызнанне літаратурных колаў. Ё. Гора вітаў "Паніхіду" як "сапраўднае з'ўленне новага таленту, які прынёс асабісты вобраз свету і асабістую мэтанакіраваную лірыку" [1, с.4]. В. Нэзвал зазначыў, што "Паніхіда" Завады – гэта выключны дэбют па сваёй цэльнасці і індывідуальнасці" [1, с.5]. Літаратурны крытык А. М. Піша звязваў "Паніхіду" з уплывам дэкадансу і "тыповай каталіцкай метафізікай" [6, с.58]. У зборнік таксама ўвайшлі кароткія лірычныя вершы і цыкл "З рамана".

У цэлым можна казаць пра некалькі тэматычных колаў, у якія можна ўпісаць усе вершы першага зборніку. Перш за ўсё трэба вылучыць астраўскую тэму (верш “Родная зямля”). Астрава бачыцца паэтам як вясковы край, з аднаго боку, і як горны край, з другога. Пейзаж Астравы вызначаецца сучаснай прамысловасцю і шматлікімі шахтамі, якія раскіданы па гэтай зямлі. З сялянскім асяроддзем звязаны экспрэсіяніскі пададзеныя постаці жабракоў (верш “Жабракі”) і цэлы шэраг хвалюючых жаночых вобразаў. Другой значнай крыніцай тэм і матываў становіцца вялікі горад, які бачыцца чэшскаму паэту бясплодным, жорсткім. У гэтым жа ідэйна-эмацыянальным рэчышчы Завада піша пра сучасны твар пасляваеннай Еўропы (верш “Старая Еўропа”). Ён не крытыкуе сучасную яму рэчаіснасць, але гаворыць пра небяспеку для сваёй уласнай душы. Гэта тэма развіваецца і ў цыкле “З раману”, дзе аўтар спрабуе адшукаць сваё месца ў сучасным свеце, піша пра трагічны лёс паэта, які зазіраючы ў чужыя душы і жыцці, страчвае сваю асабістую. Завада імкнецца пранікнуць у корань з’яў і рэчаў, але тое, што ён бачыць, выклікае толькі горыч і смутак. Рэальнае жыццё, пад уздзеяннем якога нараджаецца паэзія Вілема Завады, у многіх вершах страчвае свае прадметныя, канкрэтныя абрысы. У “Паніхідзе” часта характэрнай сітуацыяй становяцца сон, ліхаманка, засынанне, дрымота. Менавіта ў такіх станах узнікаюць пэўныя вобразы і асацыяцыі. Завада востра адчувае глыбіню і драматызм жыцця, што нараджае адпаведныя настроі ў яго лірыцы. Да іх належыць адчуванне “выгнання з раю” (першапачаткова некаторыя вершы зборніка паэт вылучаў у цыкл пад назвай ”Зямля і рай”). У вершах перадаецца элегічны смутак па страчанаму адзінству чалавека і прыроды, развагі пра цывілізацыйную актыўнасць цэлых пакаленняў (верш “Лёс”). Драматызм чалавечага існавання прыводзіць Заваду і да маральнай праблематыкі. Паэзія лёгкая і элегантная яго не вабіць. У гэтым сэнсе яго можна параўнаць з другім чэшскім паэтам, Ф. Галасам, у прыватнасці, можна правесці паралель з яго першым зборнікам “Сэпіе”.

У зборніку “Сірэна” (1932) яшчэ больш нарастае сацыяльная насычанасць завадаўскай паэзіі. Найбольшае месца ў кнізе займаюць творы, якія апісваюць парок і распад увогуле, “нарывы” чалавецтва, якія пад пяром паэта набываюць амаль містычны характар. Завада шырока выкарыстоўвае біблейскія матывы і сам выступае то ў якасці прапаведніка, які ганьбіць грэшнікаў, то ў якасці адшчапенца, які каецца ў сваіх грахах. На сучаснікаў моцна паўздзейнічалі ноты адчаю, якія прагучалі ў зборніку. Чэшскі крытык А.М.Піша зазначаў: “Сірэна” вытрымана ў адной танальнасці дэпрэсіі і жаху перад жыццём. Адчуванне безвыходнасці і ўяўленні пра гібель, фаўстаўская пакутлівая

цяга да метафізічнага пазнання і смутак агнастыцызму; адчайная спроба знайсці сябе ў богe і балючая няздольнасць да веры, спірытуалісцкая нянавісць да матэрыі, неспаталімая туга па абсалюту, пакуты свету, які страціў бога, -- вось вытокі натхнення гэтай паэзіі, якая сваімі матывамі не адзін раз нагадае нам паэзію дэкаданса” [7, с.35].

У асобных вершах зборніка трэба адзначыць аўтабіяграфічныя матывы (“Маналог”, Запавет”). У першым вершы “Маналог” аўтар адкрывае чытачу гісторыю свайго сталення як паэта і чалавека: дзіцячыя сны і мары, юнацкае ўпаенне жыццём і паэзіяй, паступовае пранікненне ў ядро рэчаў, адчуванне марнасці чалавечага існавання. У далейшых вершах (“Настальгія” і інш.) аўтар канцэнтруецца на трагічных старонках чалавечай экзістэнцыі, на дэфармацыі ўнутранага жыцця (“З глыбінь”, “У пустыні”). Ён гаворыць пра сваю сувязь з некранутай прыродай і пра самарэалізацыю ў фізічнай працы (“Паэт і селянін”), пра здольнасць да наіўнай веры ў бога. Кантрастам падаецца жыццё вялікага горада. У некаторых вершах Завада дае проста карыкатуру на мадэрны горад і яго жыхароў. На думку паэта, горад з яго барамі і бульварамі, шматлікімі насельнікамі з’яўляецца паразітам і ўспрымаецца як процілегласць і прамысловаму краю, і земляробчай вёсцы. Гандлёвы агент становіцця ўвасабленнем д’ябальскай моцы на зямлі. Бачанне жорсткіх і негатыўных гарадскіх рэалій дасягае ў Вілема Завады памераў апакаліптычных міфаў. Такая стылізацыя дазваляе аўтару даваць маральны каментарый у сваіх вершах і шукаць магчымае выйсця. Зноў у цэнтры ўвагі астраўскі пейзаж, дэфармаваны сучаснай прамысловасцю. Значнае месца ў зборніку займае ваенная тэма: Першая сусветная вайна змяніла не толькі яе ўдзельнікаў, але і іх родных. Паэт змяшчае ў “Сірэне” таксама вершы на выпадак, інтымную і рэфлексійную лірыку, вершы пра прызначэнне паэта і паэзіі. У шасці апошніх вершах, аб’яднаных у раздзел “Эпілог”, зноў узнікае тэма расчаравання ў магчымасці рацыянальна пазнаць акаляючы свет і чалавечае сэрца.

Асаблівасцю паэтыкі згаданага зборніка з’яўляецца настойлівае імкненне Завады аднавіць у сваіх правах параўнанне (у прыхільнікаў паэтызму метафара – універсальны сродак адлюстравання рэчаіснасці). Можна адзначаюць шматлікія завадаўскія “як” , строгую размернасць верша. Узрастае і рытмічная арганізаванасць. Вобразная сістэма ўскладняецца ўжываннем матываў са свету сучаснай тэхнікі, хрысціянскай і антычнай міфалогіі. Шмат месца займае апісанне геалагічных працэсаў і катастроф, што звязана з тэмай астраўскага краю. “Сірэна”, на думку даследчыкаў (А.М.Піша, Ф.К.Шальда) была інспіравана паэзіяй Ш.Бадлера, дэкаданснай лірыкай, сімвалістамі. Услед за імі Вілем Завада дэфармаваў свет так, каб яскравей выступала

яго супярэчлівасць і крызісныя праявы сучаснай рэчаіснасці. З чэшскіх паэтаў хочацца ўзгадаць О.Бржэзіну, які, несумненна паўплываў на паэтыку гэтага завадаўскага зборніка.

Новы зборнік "Дарога пешшу" убачыў свет у 1937 г. Ён уяўляе сабой спелую і цалкам выпакутаваную лірыку. Паэт адчувае надыходзячую катастрофу, якая ўжо набывае больш рэальныя абрысы. Зборнік можна лічыць гімнам роднаму краю. У кнігу ўвайшлі розныя па тэматыцы і настрою вершы. Галоўная думка паэта ў тым, што трэба пешшу ісці па сваёй краіне, пільна ўглядацца ў яе жыццё і выстаяць супраць усяго. Першы раздзел зборніка складаюць карціны астраўскага краю: "Астрава", "Камяністая зямля", "Скала, якая блукае". У зборніку назіраецца пэўная пераклічка з лірыкай П.Безруча, песняра Сілезскага краю. Усе часткі зборніка ўяўляюць сабой ў Завады гісторыю Астравы. Ён распавядае пра яе мінулае і магчымае будучае.

Астраўскі пейзаж у Завады даставерна жывапісны, дэталёвы, з яскравай сацыяльнай нотай. У наступных раздзелах Завада адыходзіць ад сацыяльнай манументальнасці і звяртаецца да камернай, прыглушанай лірыкі. Завада ў чарговы раз праявіў сябе як пясняр глыбокіх, моцных, але не яскравых пачуццяў. Ён не апявае прыгожых святаў альбо бурныя страсці, як гэта рабілі паэтысты. Зноў у зборніку дамінуюць матывы трывогі, няяснага непакою, горычы. Зборнік завяршае паэма "Дарога пешшу". Паэт вырашае аставіць "механічныя цуды" – цягнікі, самалёты, аўтамабілі – і ісці пешшу па жорсткіх шляхах і тропах роднага краю. Трэба вылучыць яскравую патрыятычную танальнасць вершаў. Лірычны герой імкнецца зліцца з зямлёй, са светам, універсумам.

Такім чынам, можна зрабіць выснову пра дамінаванне песімістычных матываў у лірыцы 1920-1930-х гг. у чэшскага паэта Вілема Завады, што знайшло ўвасабленне як ў ідэйнай, вобразнай сістэмах, так і ў агульнай танальнасці яго вершаў.

**Літаратура**


1. Závada V. Básnické dílo. T. 1-5. Praha, 1972-1979.
2. Závada V. Beze jmena. Výbor z věršů. Praha, 1970.
3. Závada V. Hořké milování. Praha, 1982.
4. Závada V. Kdo z básní zachází. Praha, 1975.
5. Závada V. Můj hlas: Výbor z poezie. Praha, 1981.
6. Píša A.M. Třícátá léta. Kritiky a státi. Praha, 1971.
7. Píša A.M. Dvacátá léta. Kritiky a státi. Praha, 1969.